УДК 94(476.6)“16”:316.342.4

# Мяшчанскі род Кудаеўскіх у сістэме кіравання Гародні

**Сліж Н.У.**
*Гродзенская рэгіянальная газета “Перспектыва”, Гродна*

*Пасля атрымання Гародняй Магдэбургскага права ў 1496 г. сістэма кіравання горада значна змянілася. Паступова сфарміравалася мяшчанская эліта, якая пасады займала з пакалення ў пакаленне. Часта гэта было толькі тры пакаленні. Праз пэўны перыяд у складзе магістрата з'яўляліся новыя прозвішчы. Варта адзначыць, што ўраднікі былі асобным слоем у мяшчанскім грамадстве. Яны праводзілі шлюбныя стратэгіі ўнутры сваёй групы. Дзяцей імкнуліся адукоўваць і пасля ўводзіць у склад магістрата. Праўда, пачыналі дзеці ўраднікаў таксама з самых нізкіх пасад. Бурмістрам ніхто адразу не станавіўся.*

*Мэта даследавання – прааналізаваць гісторыю гарадзенскага мяшчанскага роду Кудаеўскіх і паказаць яго ўплыў на сістэму кіравання ў магістраце.*

***Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі сталі прыватна-прававыя дакументы, якія захоўваюцца ў гарадзенскіх магістрацкіх кнігах. Але ў сувязі з тым, што захаваліся яны толькі з XVII ст., прыйшлося выкарыстоўваць акты з гарадзенскага замкавага суда, Метрыкі ВКЛ і магістрацкіх кніг Коўна. Сямейных архіваў мяшчан не захавалася. Галоўнымі метадамі даследавання сталі метад аналізу, параўнаўчы і храналагічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** Вывучэнне фарміравання гарадскіх эліт мае важнае значэнне, бо дазваляе прасачыць якім чынам мяшчане станавіліся ўраднікамі, іх кар'ерны рост, уплыў на мяшчанскае асяроддзе. Пры гэтым важна ўлічваць, што ў сістэму кіравання прыходзілі праз выбары. Аднак стартавыя магчымасці ў дзяцей ураднікаў былі значна большыя, бо яны атрымлівалі адукацыю. Па законе неадукаваны мешчанін не мог прэтэндаваць на пасаду. Прыклад роду Кудаеўскіх паказвае, як фарміравалася эліта Гародні. Не менш важна, што на пасадах прадстаўнікі роду пратрымаліся амаль два стагоддзі, што даволі было з'явай даволі рэдкай. Кудаеўскія мелі ўплыў не толькі ў горадзе, але і былі звязаны з павятовай шляхтай. У беларускай гістарыяграфіі роду Кудаеўскіх не прысвячалася асобных даследаванняў. Вывучэнне гарадскіх эліт важна не толькі для гісторыі Гародні, але можа стаць прыкладам для іншых гарадоў Беларусі.*

***Заключэнне.** Такім чынам, на працягу двух стагоддзяў род Кудаеўскіх быў уключаны ў сістэму кіравання горада. Матэрыяльны стан і сацыяльны статус дазволілі прадстаўнікам роду наладзіць кантакты з гарадзенскай шляхтай і нават развіць шлюбныя стратэгіі ў накірунку да гэтага саслоўя. Шлюб браўся з прадстаўнікамі сярэдняй і дробнай шляхты. Сярод іх былі Свяцкія, Даманоўскія, Міцкевічы, Талочкі і інш. Вайна 1664–1667 гг. істотна падарвала эканамічны стан Кудаеўскіх, як і іншых гарадзенскіх мяшчан.*

***Ключавыя словы:** мяшчане, эліта, Вялікае Княства Літоўскае, Гародня.*

*(Ученые записки. – 2020. – Том 32. – С. 74–80)*

# Kudayeuski Burgher Kin in the System of Garodnia Government

**Slyzh N.U.**
*Grodno Regional Newspaper “The Perspective”, Grodno*

*After Garodnia received the Magdeburg Law in 1496 the system of its government changed greatly. Burgher elite shaped gradually. Its representatives held posts for generations. It often involved only three generations. New names appeared periodically in the magistrate. We should mark that officials belonged to a special stratum. They even had their own marriage strategies within the group. Officials aspired to educate their children and give them possibility to become a member of the magistrate. The children, though, began from the lowest posts. Nobody stated as a mayor.*

*The research aims at analyzing the history of Kudayeuski burgher kin as well as at showing its impact on the system of the magistrate government.*

***Material and methods.** The main sources were private documents stored in Garodnia magistrate books. However, due to the fact that they survived only since the XVII century we had to use acts from Garodnia Castle Court, the GDL Metrics and from Kouno magistrate books. The family archives of burghers did not survive. The main research methods were the method of analysis, the comparative and the chronological methods.*

Адрас для карэспандэнцыі: ***e-mail: magistra-v@mail.ru*** – Н.У. Сліж

***Finding and their discussions.*** *Studying the formation of urban elites is important for historiography. It shows how burghers became officials, their career growth, and the impact on the bourgeois environment. It is important to pay attention that burghers came into system of governance through elections. However, the starting opportunities for the children of officials were much greater than of usual burghers because of their education. By law, an uneducated burgher could not apply for a position. The example of the Kudayeŭskis shows how the elite of Garodnia was formed. The representatives of this kin held posts during two centuries, which was rare fact. They were influential not only in the city but they also had links with local gentry. There is no research in Belarusian historiography devoted to Kudaeuski family. Studying the formation of urban elites is important not only for the history of Garodnia but also for other Belarusian cities.*

***Conclusion.*** *Thus, for two centuries the Kudaeuskis was involved into the system of government of the city. Material and social status allowed the members of the family to establish contacts with local gentry and even to develop marriage strategies towards this stratum. Marriages were held with representatives of the middle and lower nobility. Kudaeuskis married middle and petty gentry (the Sviatskis, the Damanouskis, the Mitskeviches, the Talochkis and others). The War of 1664–1667 undermined the economical position of the kin as well as of other citizens of Garodnia.*

***Key words:*** *burghers, elite, Grand Duchy of Lithuania, Garodnia.*

*(Scientific notes. – 2020. – Vol. 32. – P. 74–80)*

Пасля атрымання Гародняй Магдэбургскага права ў 1496 г. сістэма кіравання горада значна змянілася. Дзейнічалі суды: бурмістраўска-радзецкі, войтаўскі, войтаўска-лаўніцкі і крымінальны ў складзе апошняга. У магістраце пасады былі выбарныя: бурмістр, радца, лаўнік. У радзе і лаве яшчэ былі пісары. Самай ніжэйшай пасадай з’яўлялася пасада лаўніка. Як правіла, кар’еру пачыналі з гэтага ўраду, а пасля атрымлівалі пасады радцы і бурмістра. Асобы, якія сябе добра зарэкамендавалі як бурмістры, часта імі станавіліся неаднаразова.

Паступова сфарміравалася мяшчанская эліта, якая пасады займала з пакалення ў пакаленне. Нярэдка гэта было толькі тры пакаленні. Праз пэўны перыяд у складзе магістрата з’яўляліся новыя прозвішчы. Варта адзначыць, што ўраднікі былі асобным слоем у мяшчанскім грамадстве. Яны праводзілі шлюбныя стратэгіі ўнутры сваёй групы. Дзяцей імкнуліся адукоўваць і пасля ўводзіць у склад магістрата. Праўда, пачыналі дзеці ўраднікаў таксама з самых нізкіх пасад. Бурмістрам ніхто адразу не станавіўся.

Мэта даследавання – прааналізаваць гісторыю гарадзенскага мяшчанскага роду Кудаеўскіх і паказаць яго ўплыў на сістэму кіравання ў магістраце.

**Матэрыял і метады.** Асноўнымі крыніцамі сталі прыватна-прававыя дакументы, якія знаходзяцца ў гарадзенскіх магістрацкіх кнігах. Але ў сувязі з тым, што захаваліся яны толькі з XVII ст., прыйшлося выкарыстоўваць акты з гарадзенскага замкавага суда, Метрыкі ВКЛ і магістрацкіх кніг Коўна. Сямейных архіваў мяшчан не захавалася. Асноўнымі метадамі даследавання сталі метад аналізу, параўнаўчы і храналагічны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Вывучэнне фарміравання гарадскіх эліт мае важнае значэнне, бо дазваляе прасачыць, якім чынам мяшчане станавіліся ўраднікамі, іх кар’ерны рост, уплыў на мяшчанскае асяроддзе. Пры гэтым важна ўлічваць, што ў сістэму кіравання прыходзілі праз выбары. Аднак стартавыя магчымасці ў дзяцей ураднікаў былі значна большыя, бо яны атрымлівалі адукацыю. Па законе неадукаваны мешчанін не мог прэтэндаваць на пасаду. Прыклад роду Кудаеўскіх паказвае, як фарміравалася эліта Гародні. Не менш важна, што на пасадах прадстаўнікі роду пратрымаліся амаль два стагоддзі, што было з’явай даволі рэдкай. Кудаеўскія мелі ўплыў не толькі ў горадзе, але і былі звязаны з павятовай шляхтай. У беларускай гістарыяграфіі роду Кудаеўскіх не прысвячалася асобных даследаванняў. Вывучэнне гарадскіх эліт важна не толькі для гісторыі Гародні, але можа стаць прыкладам для іншых гарадоў Беларусі.

Абмежаванасць крыніц не дае магчымасці цалкам прасачыць паходжанне многіх мяшчанскіх родаў і іх далейшы лёс. Складанасці выклікае і тое, што працэс фарміравання прозвішчаў ішоў паступова. Імя бацькі ўжывалася як прозвішча сынам, а для дзяцей сына яго імя станавілася прозвішчам. Гэты ланцужок не заўсёды можа быць прадстаўлены ў крыніцах, дзе сустракалася першая форма прозвішча Кудаевіч, пазней стала Кудаеўскі. Адносна дзяцей Рамана выкарыстоўвалася форма Рамановіч, а ўнукі былі запісаны як Кудаеўскія.

Даволі рэдкі выпадак, калі гісторыю мяшчанскага роду можна прасачыць за два стагоддзі. Кудаеўскія знаходзіліся на кіруючых пасадах у XVI–XVII стст. Спачатку яны былі праваслаўнымі, а пасля сталі каталікамі. Пра ўраднікаў і сістэму кіравання ў XVI ст. захаваліся толькі асобныя звесткі. У крыніцах быў выяўлены першы сярод Кудаеўскіх бурмістр Раман Кудаевіч. Верагодна, яго братам быў гарадзенскі мешчанін Сцяпан Кудаевіч. У яго набыў зямлю шляціч Багдан Валовіч (1522) [1, dz. Metryka Litewska, sygn. 193, s. 682–683; 2, p. 126–128].

Раман згадваецца як бурмістр сярод прысутных у складзе замкавага суда, галоўнага суда рэгіёна, таксама як сведка ў справах. Фігураваў ён у судовых кнігах пад датамі 14 жніўня 1539 г., 2 красавіка 1540 г., 11 мая, 2 чэрвеня, 14 чэрвеня, 18 чэрвеня і 27 верасня 1541 г. [3, с. 31, 86, 312, 327, 342, 372, 394]. У XVI ст. выбары ў магістрат праводзіліся ў верасні [4, с. 29–30]. З дат вынікае, што Кудаевіч займаў пасаду два гады запар – 1539–1540 гг. Але не выключаем, што ён мог быць і старым бурмістрам, а ў дакументах называцца проста бурмістрам. Такія выпадкі здараліся ў дакументах.

Акрамя таго, Кудаевіч быў фігурантам у судовых справах. 31 ліпеня 1539 г. Васіца падала скаргу на яго, бо не аддаў дачку Маланку. Яна настойвала на тым, што перадала дачку ў заставу за 0,5 коп, а ён лічыў, што яна прадала яе за 1 капу. Раман прадставіў адпаведны дакумент. Замкавы суд яго скасаваў як няслушны, бо

бацькі не мелі права прадаваць у няволю дзяцей. Было загадана вярнуць грошы і аддаць дачку [3, с. 25].

Раман скардзіўся на Грынца Крывасерыча за невяртанне яму 1,5 коп літоўскіх грошаў. Грынец абвінаваціў яго ў выбіранні грошай у Зэльвян. Грошы было загадана вярнуць, а Зэльвяне павінны былі самі разбірацца з Раманам (3 ліпеня 1540 г.)[1] . 26 ліпеня 1540 г. бурмістр Раман падаў скаргу на Андрэя Семеніковіча за невяртанне пазыкі – 80 грошаў. За гэту суму Андрэй адправіў да бурмістра служыць сына. Ён быў пасланы разам з таварышамі ў Прусію, каб гнаць туды жывёлу. Але, дайшоўшы да месца, сын уцёк. Андрэй настойваў, што сын быў узяты для хатняй службы. Гэта не было прынята пад увагу судом і прысудзілі вярнуць грошы ці адслужыць [3, с. 127–128]. Сыходзячы з гэтай скаргі, можна меркаваць, што Раман быў купцом і вёў гандаль з Прусіяй. На той час меў магчымасць для сваіх спраў наймаць людзей, а не самому ездзіць.

Жонка Рамана падала скаргу на адэльскага падданага Ждана Багдановіча, што ён пакасіў сена на сенажаці, якую аддаў ім у заставу. Ждан сцвярджаў, што аглядаў сенажаць, якая знаходзілася побач. Аднак ездзіў на вазу, а не на кані і не хадзіў пешшу. Воз з сенам пакінулі пры замку, Ждана адправілі да хаты, а справу адклалі да вяртання мужа ад Боны Сфорцы (25 верасня 1540 г.)[2]. Найбольш верагодна, што выезд Рамана да вялікай княгіні быў звязаны з вырашэннем нейкіх гарадскіх спраў. Прывілеі Боны Сфорцы 1540 і 1541 гг. сведчаць пра яе актыўны ўдзел у жыцці горада.

У сям'і Рамана нарадзіліся сыны Сямён, Іван і Андрэй, дачка Марта. У дакументах яны пісаліся з прозвішчам "Романович". Мужчынскі род пайшоў далей толькі па Сямёне.

У ***Андрэя*** былі дзеці Фёдар і Марша [5, воп. 1, спр. 11, арк. 54адв.–57]. Ён валодаў дваром на Падоле і двума валокамі ў вёсцы Гнойніца [6, с. 48, 84].

***Іван*** таксама як бацька займаў пасаду бурмістра. На гэтай пасадзе ён згадваецца ў 1568, 1570, 1577, 1583, 1588 гг. [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 4, арк. 6–11; КМФ-18, спр. 62, арк. 75 адв.; спр. 59, арк. 53; спр. 280, арк. 91адв. 10, l. 17–18]. Зразумела, што Іван не адразу стаў бурмістрам, але пачатак яго кар'еры ў магістраце выявіць не атрымалася. Але як мінімум з 1567 г. ён ужо быў у складзе рады. Неаднаразовае займанне пасады бурмістра сведчыць пра яго значны ўплыў у магістраце. Пасля падскарбія ВКЛ Лаўрына Войны Іван атрымаў у арэнду гарадзенскае маставое мыта на перыяд 1578–1581 гг. Ён павінен быў выплачваць у год 80 коп літоўскіх грошаў (1588) [5, КМФ-18, спр. 59, арк. 53–53адв.].

Іван займаўся і гандлем. Бурмістраўска-радзецкі суд Коўна прысудзіў выплаціць яму кампенсацыю 100 коп літоўскіх грошаў. У 1582 г. ковенскі мешчанін Мацей Гувіловіч Бурніскі павінен быў даставіць у Гародню 3 лашты солі, кожны лашт па 10 коп і 30 грошаў. Грошы ён атрымаў, а тавар не даставіў. У якасці доказу была прадстаўлена перад судом дамова. Бурніскі выканаў рашэнне суда (1583) [7, l. 17–19].

Іван валодаў пляцамі на вул. Дзям'янаўскай і Навадворскай, валокамі ў вёсцы Гнойніца (1561) [6, с. 36, 62, 84]. Гарадзенскі харужы Фёдар Іванавіч Кунцэвіч прадаў яму за 20 коп агарод. Раней ён набыў яго разам з Тужовічамі (Паснікоўшчына) у Настассі Сангушкаўны, жонкі Сямёна Адзінцэвіча. Агарод межаваў адным бокам з вуліцай, якая ішла з Падолу да царквы Чэснага Крыжа, міма старой Плітніцы, другім – са старой дарожкі, а трэцім – са сцежкай, якая ішла паміж ірвамі, а адным бокам – з агародам нябожчыка Сямёна Цітовіча, гарадзенскага пратапопа, а чацвёртым – з грунтам гарадзенскага мешчаніна Паўла Манчохі.

Маёмасць належала да шляхецкай юрысдыкі (1573) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 9, арк. 490–491]. Пералічаныя вышэй факты сведчаць пра заможнасць Івана.

Бурмістр таксама фігураваў у судовых справах. Ён падаў скаргу на Фёдара Сасіна з-за укрыццё яго збеглай чэлядзі (5 кастрычніка 1568) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 4, арк. 6–11]. Іван выклікаў у суд земяніна Якуба Жэліслаўскага па справе аб незаконным трыманні яго ў зняволенні (1568 г.) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 5, арк. 72]. Іван меў справу са шляцічам Станіславам Хадакоўскім і яго жонкай Барбарай з-за зямлі ў Малахавічах (1586) [5, КМФ-18, спр. 280, арк. 91адв.–92адв., 119–119адв.].

У Івана была толькі дачка Ганна. Яна выйшла замуж за гарадзенскага шляхціча Івана Пуціўляніна Свяцкага. Яго бацька Грыгорый Іванавіч за пасаг у суме 60 коп літоўскіх грошаў запісаў нявестцы 200 коп вена на частцы сына на Свяцку (1575).

Іван перанёс вена на Ліпкупяны (Троцкі павет) як на 1/3 сваіх маёнткаў (1574). За добрае да сябе стаўленне падарыў жонцы фальварак Лаздзея [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 8, арк. 100адв.–106адв.]. Гэта неадзінкавы выпадак шлюбу паміж мяшчанкай і шляхцічам у гарадзенскім рэгіёне.

Па законе шляхта надавала саслоўны статус жонкам. Таму мяшчанкі з заможных сем'яў прывабілвалі мясцовую шляхту.

Ганна была адзінай спадчынніцай бурмістра. Пасля смерці бацькі атрымала пляц на Падольнай, які быў набыты ў Ф. Кунцэвіча. Разам з мужам яны прадалі яго за 40 коп Марціну Сямёнавічу Макрэцкаму.

На той час пляц межаваў адным бокам з вуліцай да царквы Св. Крыжа, другім – з домам нябожчыка Сямёна Лук'янавіча, трэцім – з домам пляменніка Ганны – Фёдара Андрэевіча Раманавіча, дзе жыў венгр Балвер Марцін, чацвёртым – з пляцам Юрыя Сямёнавіча (1597) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 15, арк. 335адв.–337].

***Марта*** выйшла першы раз замуж за Пілецкага, а другі – за гарадзенскага шляхціча Фёдара Даманоўскага. Дачка заможнага бурмістра была добрай партыяй для шляхціча.

[1] У крыніцы толькі называюцца "Зельвяне", больш інфармацыі не прыводзіцца. Сыходзячы з назвы можна меркаваць, што паходзілі з Зэльвы (цяпер мясцовасць у Гродзенскай вобласці) [3, с. 123–124].

[2] Імя жанчыны не згадваецца [3, с. 171].

У 1571 г. яны разам згадваліся ў судовым працэсе з Богушам Сцярпейкам за права валодання застаўным маёнтка Лаша, які знаходзіўся каля Індуры[3].

У шлюбе ў Фёдара і Марты не было дзяцей. Муж памёр раней, а Марта дажывала свой век у пляменніцы Ганны, дачкі Івана Кудаеўскага і яе мужа Івана Свяцкага. Тэстамент яна склала 15 лютага 1589 г., прызнала яго ў гродскім судзе 18 лютага, а пераакатыкацыя ў земскім судзе была 10 студзеня 1591 г. Сваякі за догляд атрымалі маёнтак Дзямідкава ў Гарадзенскім павеце. У дакуменце згадваліся дзеці Андрэя – Фёдар і Марша. Фёдар атрымаў у маёнтку дзве часткі грунту і сенажаць, а Марша, якая пры ёй пражывала – рухомыя рэчы. Тэстатарка прасіла пахаваць яе цела ў Прачысценскай царкве ў Гародні [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 11, арк. 54адв.–57].

Пасля смерці жанчыны адбыўся судовы працэс паміж сваякамі (1594). Скаргу падалі дзеці Сямёна Кудаеўскага, іншыя пляменнікі Марты – Яраш і Астафей ад сябе і ад імя сясцёр Багданы (жонка Андрэя Міцкевіча) і Паланеі (жонка Андрэя Талочкі) – на Івана Свяцкага і яго жонку Ганну Кудаеўскую, а другую скаргу – на Фёдара Андрэевіча Кудаеўскага. Спрэчка ішла за спадчыну цёткі – маёнтак Дзямідкава [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 13, арк. 441–445адв.].

Скаржнікі сцвярджалі, што 9 лютага 1589 г. Свяцкія самі прыехалі ў маёнтак Дзямідкава. Марфа была хворая, забралі яе разам з рэчамі да сябе ў дом на Падоле. Там яе трымалі да самай смерці. Карыстаючыся хваробай, намовілі ў тэстаменце запісаць на іх Дзямідкава і рухомыя рэчы. Хоць згодна з правам уся яе маёмасць размяркоўвалася паміж сваякамі. Пры гэтым слугам і чэлядзі забаранілі даваць Марфе магчымасць для кантакту з іншымі сваякамі. Пахавалі яе не па-хрысціянску і не па звычаі. Нікому не паведамілі пра яе смерць. Пахаванне адбылося 21 лютага 1589 г. у Прачысценскай царкве. Скаржнікі запыталі ў Свяцкіх пра яе тэстамент перад людзьмі з земскага суда і магістрата, але яны не паказалі дакумент і пайшлі. Сумнеў у Кудаеўскіх выклікала адпаведнасць заканадаўству дакумента, а таксама магчымасць прыехаць у горадураднікаў гродскага суда. Ураднікі жылі па-за межамі горада: падстароста Уданоўскі Венцлаў за 4 мілі, а суддзя Багдан Словік за 10 міль.

Умацаванаму з боку Свяцкіх прыйшлося прадставіць тэстамент, каб даказаць яго сапраўднасць і адпаведнасць праву. А таксама адзначыць, што як шляхцянка Марфа мела права самастойна распараджацца маёмасцю. У выніку тэстамент прызналі адпаведным праву і пакінулі пры моцы. Заўважым, што звесткі ў справе супадаюць з тэстаментам.

***Сямён Кудаеўскі*** судзіўся з жыдом Лазарам Ліхманам. Апошні пазычыў у яго 4 капы і 45 грошай пад заставу срэбраных рэчаў. Але ў вызначаны тэрмін не змог іх выкупіць. Лазар пры сведках казаў, што рэчы Сямён можа пакінуць у сябе (1541) [3, с. 283–284]. У валочнай памеры згадваецца пра валоданне Сямёнам пляцам на вул. Мірсніцкай, валокай у вёсцы Гнойніца і двума валокамі ў вёсцы Малахавічы[4].

Сямён быў жанаты з Марынай Сямёнаўнай. Пасля яго смерці яна выйшла замуж за шляхціча Яна Стабінскага. У 1573 г. яна фігуравала як яго жонка [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 7, арк. 170адв.–172адв.; спр. 15, арк. 262адв.–264; спр. 16, арк. 262адв.–264]. Значыць да таго часу Сямён ужо памёр. Аднак ці быў гэта адзін шлюб у яго жыцці, дакладна сказаць цяжка. З дакументаў вядома, што пасля Сямёна засталіся дзеці Яраш, Астафей, Багдана і Паланея. Сыны займалі пасады ў гарадзенскім магістраце.

*Яраш* фігураваў на пасадзе лаўніка (1597, 1610) [1, AR, dz. XVIII, sygn. 304, k. 1–6; 8]. Ён меў дом на Падоле. Пра гэта згадваецца ў продажы дома шляхцянкі Аўдоцці Мацееўны Грычынавай Вайнянкі, удавы Канстанціна Кунцэвіча, шляхцічу Якубу Гзоўскаму. Ён межаваў з домам Яраша (1590) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 11, арк. 106–107].

*Паланея* выйшла замуж за Андрэя Юр'евіча Талочку 5 ліпеня 1573 г. Гэта быў яго другі шлюб. Змовіла дачку маці Марына Сямёнаўна, якая на той час ужо была жонкай шляхціча Яна Стабінскага, з бацькам жаніха. Яна дала пасаг 20 коп літоўскіх грошаў і рухомыя рэчы ў гэтай жа суме. Вена было запісана Андрэем у 110 коп на 1/3 Жыдомлі і Малявіцаў. У шлюбе нарадзіліся Сямён, Павел, Якуб, Марына, Ганна і Барбара. Пасля смерці мужа Паланея падала скаргу на пасербаў Яна і Войцеха, а таксама на сына Сямёна, які быў адзіным з дзяцей паўналетнім на той час, за невылучэнне ёй ўдовінай часткі. Быў прадстаўлены вяноўны запіс мужа ад 5 ліпеня 1577 г., які быў актыкаваны 22 чэрвеня 1578 г. Запіс мужа прызналі праўным і слушныя для вылучэння 1/3 Жыдомлі (1599) [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 7, арк. 170адв.–172адв.; спр. 15, арк. 262адв.–264; спр. 16, арк. 198–199].

*Багдана* першы раз выйшла замуж за Андрэя Міцкевіча (Міціковіча), а другі – за Войцеха Залескага. Яна памерла бяздзетнай. Усё сваю маёмасць пакінула сваякам – лаўніку Фёдару Юрэвічу і яго жонцы Ганне Талочкаўне[5]. Апошняя была яе пляменніцай, дачкой Паланеі. Кудаеўскія – Сцяпан, Матыс, Станіслаў, Ян і муж іх сястры Станіслаў Табенскі падалі скаргу на спадчыннікаў Багданы. Іх абвінавачвалі ў тым, што яны забралі рухомыя рэчы і нерухомасць памерлай іх цёткі. Ф. Юрэвіч сведчыў, што трымаюць маёмасць згодна з тэстаментам. Быў прадстаўлены дакумент за 1621 г., які быў актыкаваны перад урадам. Маёмасць жанчына падаравала па наступных прычынах: яны былі сваякамі, даглядалі яе падчас хваробы, выпла-

[3] Імя Пілецкага дакумент не згадвае [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 6, арк. 135–138, 877–885].

[4] У валочнай памеры ён пішацца як Сяхно, а не Сямён [6, с. 31, 73, 85].

[5] Ганна Талочкаўна памерла ў 1644 г. Па тэстаменце яе дом на вул. Маставой быў падзелены паміж мужам Ф. Юрэвічам і пляменніцамі Люцыяй (жонка злотніка Лукаша Скроблякевіча) і Альжбетай (жонка Тамаша Дмухоўскага) [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 102–103, 105–106, 276–276адв.].

цілі пазыкі. Уласнасць была набыта разам з мужамі. Аб гэтым сведчыў выпіс з войтаўска-лаўніцкага суда 1576 г., тэстамент А. Міцкевіча за 14 чэрвеня 1594 г., запіс Міцкевіча за 7 кастрычніка 1594 г. Кудаеўскія настойвалі, што тэстамент не адпавядае Магдэбургскаму праву. Але высветлілася, што маёмасць Багдане прыйшлася не дзедзічным правам і не праз падзел, а праз мужа. Таму яна мела права распараджацца ёй па сваім меркаванні. Войтаўска-лаўніцкі суд права на маёмасць прысудзіў Багдане і нашчадкам, а тэстамент пакінуў у моцы. Гэты дэкрэт быў пацверджаны (1622, 1623) [5, КМФ-18, спр. 302, арк. 45адв.–46адв.].

Верагодна, наступны працэс быў звязаны з папярэднім у плане канфліктных адносінаў. Фёдар Юрэвіч падаў скаргу на Сцяпана Кудаеўскага спачатку ў магістрат, а пасля – у Асэсарскі суд з прычыны "пахвалак", нападу на дом і збіцця на дарозе чалядніка. У магістраце Кудаеўскі сцвярджаў, што не адносіцца да гарадской юрысдыкцыі, бо не пражываў у горадзе. Ён не з'явіўся ў Асэсарскі суд, які ўхваліў рашэнне магістрата і прызначыў выплаты за шкоды Кудаеўскаму (1622) [5, КМФ-18, спр. 302, арк. 20–21]. Сцяпан быў жанаты з Ягнешкай Крыкоўскай. Пасля смерці мужа яна выйшла замуж другі раз за Крыштафа Календу[6].

*Астафей* згадваецца лаўнікам (1588), бурмістрам (1593, 1598), радцам (1608), лентвойтам (1616) [5, КМФ-18, спр. 77, арк. 508адв.; спр. 287, арк. 486–486адв.; 9; 10, f. 1282, ap. 1, b. 11218]. Ад магістрата Астафей займаўся справамі аб нявыплаце шляхтай чыншу з пляцаў, якія знаходзіліся пад гарадской юрысдыкцыяй. Ён атрымаў выпіс з гродскага суда аб перадачы скаргі ад гарадзенскіх мяшчан кухмістру ВКЛ Мікалаю Сапегу (1604) [11, l. 23].

Па прычыне ўбоства дзве валокі Кудаеўскіх былі вызвалены ад падаткаў у 1609 г. [11, l. 31] Але дакумент не ўдакладняе імёны Кудаеўскіх. Аднак, верагодна, гэта былі браты Яраш і Астафей.

Астафей валодаў домам на вул. Маставой на Падоле. У продажы 1608 г. Крыштафа Крыштафавіча Радзівіла двара Адаму Храбтовічу згадваецца, што ён знаходзіўся каля Нёмана, як ісці з замку вулачкай каля царквы Св. Прачыстае на Падол па правай руцэ, з аднаго боку паміж домамі падкаморыя Грыгорыя Масальскага і А. Кудаеўскага [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 18, арк. 287адв.–288адв.].

Канстанты Турчыновіч і Ганна Лапянка атрымалі 300 коп літоўскіх грошаў за застаўную маёмасць Сцярпейкі ў Гарадзенскім павеце ад Астафея Кудаеўскага і яго жонкі Рэгіны дэ Грыпаўны праз зяця Станіслава Табенскага. Яму фальварак цесць перадаў у вечнае валоданне (1617)[7]. З дакумента вынікае, што Астафей быў жанаты з дачкой муляра з Італіі Антонія дэ Грыпы, які быў запрошаны С. Баторыем для будаўніцтва замка і Фарнага касцёла [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 25, арк. 211–211адв.]. Рэгіна была яшчэ жывая ў 1665 г. [5, ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 116–117]. У шлюбе нарадзіліся Сцяпан, Матыс, Станіслаў, Ян, Мікалай і дачка, якая пазней выйшла замуж за С. Табенскага [5, КМФ-18, спр. 302, арк. 45адв.–46адв.].

Сцяпан, Мікалай і Ян прадалі бацькоўскі пляц на вул. Маставой Астафею Курчу. Ён знаходзіўся з левага боку як ісці на Рынак, межаваў з аднаго боку з пляцам Грыгорыя Вараб'я, з другога – з пляцам кляштара бернардынак, дзе жыў Ян-маляр, з трэцяга боку – з вуліцай, якая дзяліла той пляц з пляцамі мяшчан бернардынак, з чацвёртага боку – з вул. Маставой. А. Курч падарыў пляц францысканскаму кляштару ў 1635 г. [12].

*Матыс Кудаеўскі* займаў пасаду лаўніка ў 1625 г. Хаця перыяд на пасадзе мог быць даўжэйшым. Ён меў дачку Ядвігу. Яна выйшла замуж за Аляксандра Максімавіча Хацкевіча. Яны набылі ў радцы Яраша Высоцкага і Дароты Земброўскай 4 валокі ў Гнойніцы і Малахавічах за 2000 злотых (1640).

Пазней А. Хацкевіч і Ядвіга прадалі частку Станіславу Іванавічу Бутоку і Ахапе Харасімавічоўне за 50 коп (1643) [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 144адв.–146адв., 254–254адв.].

*Мікалай Кудаеўскі* фігураваў на пасадзе лаўніка (1638, 1639), радцы (1640–1650, 1654, 1659–1665), бурмістра (1655) [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 90–95, 101адв. і інш.; КМФ-18, спр. 124, арк. 185адв. – 186; ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 3 і інш.; 10, f. 694, ap. 1, b. 4624, l. 2, 4–5, 6–7v]. Як мінімум, яго праца ў магістраце налічвае 27 год. Яна прыйшлася на вельмі цяжкі перыяд, на вайну 1654–1667 гг. У дакументах адзначана прысутнасць Мікалая на пасяджэннях судоў, але пра тое, як ён выконваў сваю працу, які быў узровень яго кампетэнтнасці, сказаць вельмі цяжка.

Мікалай быў жанаты з Гальшкай Зялескай. Гэта быў яе другі шлюб. Першы раз яна была замужам за лаўнікам Касперам Рэйхембергам[8]. У дом мужа ўнесла пасаг 1000 злотых, за што атрымала запіс на маёмасці. У шлюбе нарадзіўся сын Астафей, які да дасягнення паўналецця выхоўваўся ў сям'і з Кудаеўскім. Грошы – 900 злотых, якія былі ўнесены Гальшкай у другім шлюбе, пайшлі на выплаты пазыкаў і побытавыя справы. У 1645 г. Гальшка і Мікалай вылучылі Астафею спадчыну: 1,5 валокі ў Малахавічах, 0,5 у Гнойніцы, 4 валы, 2 каровы, 2 кані, 2 авечкі, 5 свіней. А Мікалай Кудаеўскі павінен быў пабудаваць святліцу з сенямі і адрыну, даць за збожжа 150 злотых [11, l. 47].

Пра Гальшку і яе першага мужа Каспера Рэйхенберка ўтрымліваецца інфармацыя ў іншых дакументах. Яны ў свой час мелі грунты ў Малахавічах. Марцін Станіслававіч Сцернік і Агап'я Цімохаўна прадалі за 30 коп літоўскіх грошаў чвэрць грунту ў Малахавічах, якая была набыта ў Рэйхенберка і яго жонкі Балтрамею Кашоўніку і Еве Дайновічаўне (1642). Ян Івановіч і Ахіма Дурнейкаўна набылі за 20 коп у Марціна Станіслававіча і Агап'і Шульцаўны

[6] Згадка пра другі шлюб Ядвігі ўтрымліваецца ў дакуменце за 1642 г. [2, КМФ-18, спр. 302, арк. 236адв.–237].

[7] У дакуменце пра А. Кудаеўскага адзначана як пра земяніна [5, ф. 1755, воп. 1, спр. 25, арк. 211–211адв.].

[8] Каспер Рэйхенберг згадваецца на пасадзе лаўніка ў дакуменце 1629 г. [1, Archiwum Radziwiłłów, dz. XVIII, sygn. 304, 313, k. 27].

палову валокі ў Малахавічах, якую раней яны таксама купілі ў Рэйхенберка (1638) [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 212–214].

Мікалай напісаў тэстамент 4 мая 1665 г., а актыкаваны дакумент быў 12 мая [дадатак 1]. Ён прасіў пахаваць цела ў бернардынскім касцёле, у склепе пры жонцы. Рухомыя рэчы былі забраны маскоўскім войскам і на той час нічога не засталося. Ад жонкі Мікалаю засталіся дзве незасеяныя валокі ў Малахавічах, дзе знаходзілася толькі пякарня. Гэта маёмасць павінна была перайсці па спадчыне пляменніку Яну Кудаеўскаму. Але за тое, што ў старасці Мікалай не меў шанавання, трываў збіццё і абразы, пляменнік быў выдалены ад спадчыны. За дапамогу ўсё было запісана лентвойту Ганусу Паўльсену. Са згаданых двух валок палова знаходзілася ў заставе ў татарына Юхны. Акрамя таго, Мікалай прасіў яго пахаваць і памінаць яго душу і душу жонкі, а таксама заплаціць пазыкі. У выпадку смерці Яна Кудаеўскага яго пляц пераходзіў да Мікалая, а той яго перадаваў брацтву Святой Тройцы. У маці для панны Рэйхенберкаўны прызначалася тры падушкі, дзве пярыны, коўдра, два тканыя абрусы і скрыня з хустамі. У гэтай жа скрыні знаходзіліся ўсе дакументы на маёмасць, якія павінен быў узяць Паўльсен. Першы тэстамент, у якім былі запісы Казіміру Цвіклічу, Мікалай скасаваў. У прысутнасці ўраднікаў пра пазыкі Кудаеўскага згадалі Аляксандр Хацкевіч (60 злотых), бурмістр Войцех Пятроўскі (8 злотых), лаўнік Сымон Шаматула Сапінскі (2,5 злотых) [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 116–117].

З тэстамента вынікае, што свае апошнія гады Мікалай дажываў вельмі цяжка. Яму дапамагаў Г. Паўльсен. Вайна істотна падарвала яго матэрыяльны стан, а канфлікт з пляменнікам – фізічны і маральны. Гэтай крыніцы недастаткова, каб высветліць прычыны нязгоды паміж сваякамі, але крыўда Янам была нанесена сур'ёзная, калі яго аддалілі ад спадчыны. З дакумента вынікае, што на той час жылі толькі маці Мікалая і пляменнік Ян, пра іншых сваякоў згадак не было.

Пляменнік *Ян Кудаеўскі* меў пляц на Падоле. Пра яго згадвалася ў продажах Крошнеўчанак Альжбеты, жонкі Мацея Карлоўскага, і Люцыі, жонкі радцы Яна Зелепугі, а таксама Клімчовічаў – Яна, Войцеха, Стэфана і Евы (1673). Пляцы побач з былой царквой Чэснага Крыжа скупаў Андрэй Катовіч для заснавання на іх касцёла і кляштара кармелітаў босых. Ян таксама прадаў свой пляц на вул. Чэснахрысцінскай за 200 злотых. Ён межаваў з аднаго боку з пляцам Карлоўскай, з другога – з пляцам нашчадкаў мешчаніна Марціна Клімчовіча, чолам – з вул. Чэснахрысцінскай, а тылам – з пляцам Прылуцкага (1673). Прычым дакумент Кудаеўскі падпісаў сам. Гэта сведчыць аб тым, што ён атрымаў адукацыю, бо даволі часта за мяшчан ставілі подпісы ўраднікі [5, ф. 1761, воп. 1, спр. 1, арк. 262адв.–263адв., 264адв.–265, 272–273]. Ян не згадваецца ў рэестры Гародні за 1680 г., як і прозвішча Кудаеўскіх. Верагодна, ён на той час ужо памёр і не пакінуў нашчадкаў. Аднак дакладна ўстанавіць, чыім быў сынам Ян, не атрымалася.

**Заключэнне.** Такім чынам, на працягу двух стагоддзяў род Кудаеўскіх быў уключаны ў сістэму кіравання горада. Пасады ў магістраце займалі Раман, Яраш, Астафей, Іван, Сямён, Мацей, Мікалай. Самай высокай пасады, бурмістр, атрымалася дасягнуць у Рамана, Астафея і Мікалая. Дакладна вядома, што гандлем займаліся Раман і Іван. Прычым гэта быў міжнародны гандаль з Караляўцом. Пра прафесіі іншых асобаў дакладна сказаць цяжка. Яна таксама маглі працягнуць сямейную традыцыю. Матэрыяльны стан і сацыяльны статус дазволілі прадстаўнікам роду наладзіць кантакты з гарадзенскай шляхтай і нават развіць шлюбныя стратэгіі ў накірунку да гэтага саслоўя. Шлюб браўся з прадстаўнікамі сярэдняй і дробнай шляхты. Сярод іх былі Свяцкія, Даманоўскія, Міцкевічы, Талочкі і інш. Вайна 1664–1667 гг. істотна падарвала эканамічны стан Кудаеўскіх, як і іншых гарадзенскіх мяшчан. Бурмістр Мікалай быў апошнім, хто атрымаў пасады ў гарадзенскім магістраце.

**Дадатак 1. Тэстамент Мікалая Кудаеўскага 1665 г.**

Тэстамент прыводзіцца на мове арыгіналу. Напісаны на польскай мове XVII ст. Скароты раскрыты, пераклад лацінскіх слоў дадзены ў спасылках. Дакумент захоўваецца ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі (ф. 1800, воп. 1, спр. 1, арк. 116–117).

[116] Działo się na urzedzie Woytowskim Ławniczym Grodzienskim in presentia[9] Szł(ache)tnych Panow Hanusa Paulsena lantwoyta, Matyasza Massnickiego, Fiodora Bobrykiewicza, Jakuba Szarawskiego, Kaspra Wroblewskiego, Adama Iwaniszewskiego, Symona Szamotuły Sapinskiego Ławnikow, dnia 12 Juny A(nn)o 1665.

Testament nieboszczyka Pana Gudaiewskiego[10]

Przed kturym urzędem powstawszy z mieysc swoich Szł(ache)tni Panowie Matyasz Massnicki y Adam Iwaniszewski ławnici testament zeszłego nieboszczyka P. Mikołaia Gudaiewskiego raycy grodz(iens)kiego przyznali y do akt podali w te słowa pisany.

Ja Mikołay Gudaiewski rayca grodzienski czynie wiadomosc tym moim ostatniey woli zapisem testamentem iz ia wysz mianowany Gudaiewski widząc w podeszłym wieku moim blisky kres zycia moiego przy słabosci zdrowia moiego, a tak cieszkiey chorobie moiey Naywyszemu Tworcy memu dziękuję iz mię na tamten swiat zostawiąc przy zupełnym rozumie w tym ostatnym punctie zycia mego zachowac raczył. Dusze tedy moią grzeszną w ręce nieagarnionie miłoserdzia Boskiego oddaią. A ciału memu pogrzeb w kosciele Wielebnych Oycow Bernardynow conventu grodzienskiego w sklepe, gdzie nieboszczka małzonka moia lezy naznaczam. Ubostwem zas moim ktorego bardzo mało, bo wszystko ubostwo moie nieprzy(iace)łł zobrał. Nic tedy z ruchomosci iako srebra, złota, cyny, miedzi nie maiąc, gruntami nie miał a swemi mnie od nieboszczki małzonki moiey in umi reformationis[11] zapisane mi, to iest włok dwie we wsi Małachowiczach goła

[9] У прысутнасці.

[10] Падкрэслена ў дакуменце. Тут і далей памылкова пішацца прозвішча. Трэба – Kudajewski.

[11] Запіс.

nie zasiane na ktorych tylko piekarenka stoi lubo by iure successionis synowcowi memu Janowi Gudaiewskiemu nalezały, ale ze w starosci moiey y w cięszkim upadku y ubostwie moim lat przeszłych od pomienionego synowca moiego wiele razy iako słowami uszczypliwymi y niewstydliwemi zelzowy, a po kilka krwe y zbity cięszko, a tych tedy mian onego od succesią oddalam a lubo bym takowe onego występki o ktore niepoiednikrotnie przed P. Lantwoytem grodzienskim wskarzałem się teraz przebaczył, przebaczyc chciał iako z te wszystkie urazy moie zelzywosc y obelge od iego poiętą opuszczam y przebaczam spodziewaiąc się po niekonczonym miłosierdzim Tworce y Odkupcela mego ze tez Bog moy grzechy moie odpuscic raczy obawiaiąc się przestrogi Boskie insi remis critis non remittentur nobis , ale iednak niestatek synowca mego y rospustę maiąc przed oczyma, iz gdy by on się ten grunt w ręcie miał dostac pow(in)nieby za marną rzecz zbywszy mało co abo nie o dusze moią y małzonki moiey dbał y pominał z drugiey strony siła [116 адв.] dobrosci poratowania w ubostwie moim y w chorobie moiey pracom tego starania doznawszy sł(awe) tnego Pana Hanusa Paulsena lantwoyta grodzienskiego ku sobie za co nich mu Naywyzszy stokrotnie nagrodza wszelkim darami swoimi z tych przyczyn czasy wiecznemi gruntu włok dwie, to iest pułtory nikomu nie zawiedzione, a ni zadnym długiem onerowane, a puływłoki zastawione u Pana Juchna we złł 30 tatarzyna łosossienskiego za oddaniem tych pieniędzy temu Panu Juchne od Pana Hanusa onemu cale włok dwie czasy wiecznie leguię y zapisuię. A P. Hanus Paulsen lantwoyt grodzienski pogrzeb ciału memu iako zwyczay sprawie ma y coroczney mszy swietych dnie spiowanych za duszę moią y małzonki moiey zakupic powinien Oycom Bernardynom za dług inny złotych 200 według legaciy nieboszczki siestrzenice moiey u Pani Tabenskiey Pan Hanus Paulsen odzyskac ma, a odzyskawszy Oycom Bernardynom oddac. A złotych 100 od teyze siestrzenice moiey mnie legowane tenze Pan Hanus Paulsen od Pani Tabenskiey odzyskac ma y za odzyskaniem tych pieniędzy długu złotych 60 winnego Panu Alexandrowi Chackiewiczowi, a złotych 30 Panu Janowi Gudaiewskimu synowcowi memu takze winne oddac powienien będzie. Pani Łukaszowey Neapoliciney jeczmienia beczek dwie y cwiertek dwie oddac P. Hanus Paulsen powienien. A ze pewney nie mam wiadomosci iezeli synowiec moy w zywocie zostaie tedy plac iego wieczysty in quantum by go w zywocie nie stało mnie nalezący do Bractwa Troyce Przenaswiętszey leguię y zapisuię. W matce miey Pannie Rechemberkownie poduszek trzy, pierzyn dwie, kołderke, obrusow dwa tkackich, skrzynie z chustami temi teyze y matce moiey leguię y zapisuię. W teyze skrzynie sprawy wszytkie na grunty pomienione naleząiac zostaią, ktore Panu Hanusu Paulsenu nalezec maią czasy wiecznemi. Tak tedy ostatnią wolą moię y testament koncza. Włok te dwie w Małachowiczach lezące nikomu inmemu tylko Panu Hanusowi Paulsenowi leguię y zapisuię. A testament moy pierwszy kturym tez dobra moie P. Kazimierowi Cwikliczowi legował cassuię annulluię. Pana Hanusa Paulsena upraszam aby za duszę moią y małzonki moiey dobrze czynił y nie przepominał. I na to dla lepszey wiary rękę moią własną przy bytnosci Panow ławnikow do tego testamentu ode mnie uproszonych y od Pa(now) subdelegata deputowanych y przy caley wsi Małachowiczach męzach y sąsiadach moich koncząc podpisuie. Pisan w Małachowiczach. Roku Panskiego 1665 m(ie)s(ią)ca maia dnia 4. U tego testamentu podpisy ręk temy słowy. Mikołay Gudaiewski rayca grodzienski. Będąc ia iako subdelegat przydeputowanych z urzedy osobach przy ostatniey woli testamentu wyszmianowanego testatora Pana Mikołaia Gudaiewskiego raycy grodzienskiego. [117] Jakub Szarawszki rayca grodzienski. Jan Zielepuha rayca grodzienski. Wiadomy tego testamentu y ustnie z urzedu przydany y przy smierci nieboszczyka będący za powtornym ządaniem Pana Kudaiewskiego przy bytnosci wszystkich sąsiad wsi Małachowicz rękę swą podpisał Matyasz Massnicki ławnik grodzienski. Byłem przy tym testamencie deputowany od Pana Subdelegata sądy woytowskiego Adam Iwaniszewski ławnik przysięgły miasta JKM Grodna mpp. Po ktorego testamentu przeczytaniu będąc praesens P. Alexander Chackiewicz przypopowiedanie swoie czynił iz nieboszczyk P. Mikołay Kudaiewski został winien onemu na oblig złł 60. Takze P. Woyciech Piotrowski burmistrz tegoroczny przypowiedał się nieboszczyk P. Kudaiewski został winien złł 8. Item P. Symon Szamatuła ławnik przypowiedanie swoie czynił iz złł pułtrzecia został winien nieboszczyk.

## Літаратура


1. Archiwum Główne Aktów Dawnych. – Dz. Metryka Litewska. – Sygn. 193; Archiwum Radziwiłłów. – Dz. XVIII. – Sygn. 304, 313.
2. Lietuvos Metrika. Kn. 25 (1387–1546): Užrašymų knyga 25 / Parengė D. Antanavičius, A. Baliulis. – Vilnius: Mokslo ir enciklopedijų leidybos institutas, 1998. – 460 p.
3. Акты, издаваемые Виленскою археографическою комиссиею. – Т. 17: Акты Гродненского земского суда. – Вильна: Тип. А. Г. Сыркина, 1890. – 638 с.
4. Сліж, Н. Магдэбургскае права ў Гародні ў канцы XV – першай палове XVI ст.: увядзенне і развіццё / Н. Сліж // Гарадзенскі палімпсест. 2011. Асоба, грамадства, дзяржава. XV–XX стст. / пад рэд. А.Ф. Смаленчука, Н.У. Сліж. – Мінск, 2012. – С. 10–44.
5. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 1755. Воп. 1. Спр. 4, 5, 6, 7, 8, 9, 11, 13, 15, 16, 18, 25; Ф. 1761. Воп. 1. Спр. 1; Ф. 1800. Воп. 1. Спр. 1; КМФ-18. Спр. 59, 62, 77, 124, 280, 287, 302.
6. Писцовая книга Гродненской экономии. – Вильна: Тип. А.Г. Сыркина, 1882. – Ч. 2. – 607 с.
7. Vilnau Universiteto Bibliotekos Rankraščių skyrius. – Kauno magistrato aktų knyga, 1583–91. – 322 l.
8. Gabinet rękopisów Biblioteki Uniwersytetu Warszawskiego. – Sygn. 260. – Dok. 42.
9. Lietuvos mokslų akademijos centrenės bibliotekas Rankraščių skyrius. – F. 16–207. – Збор дакументаў XVI–XVII стст. – 95l.
10. Kałamajska-Saeed M. Kościoł p.w. Matki Boskiej Anielskiej i klasztor franciszkanów / M. Kałamajska-Saeed // Kościoły i klasztory rzymskokatolickie dawnego województwa trockiego. Grodno. – Cz. 4. T. 3 / Red. M. Kałamajska-Saeed. – Kraków, 2016. – S. 58–89.
11. Lietuvos Vaistybes istorijos archyvas. – F. 694. Ap. 1. B. 4624; F. 1282. Ap. 1. B. 11218.
12. НГАБ у Гродне. – Ф. 1664. Воп. 1. Спр. 380.


*Паступіў у рэдакцыю 13.12.2020.*